# БРАЦКАЯ МАГІЛА
# (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, В. ВОЛМА)





**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле [дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь](#)):** 613Д000572

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, в. Волма, усходняя ўскраіна вёскі

**Каардынаты:** 53.896213, 27.917922

**Кароткае апісанне:**

Брацкая магіла (1943–1944 гг.) ў в. Волма Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі. Знаходзіцца на ўсходняй ускраіне вёскі. У 1969 г. на магіле пастаўлен помнік. У брацкай магіле пахавана 83 воіна, якія загінулі ў 1943-1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Волма Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі (**613Д000572**), які ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Помнік знаходзіцца на ўсходняй ускраіне вёскі. У 1969 г. на магіле пастаўлен помнік, які выкананы з чорнага граніту. Пліта з пералікам іменаў загінуўшых адсутнічае. Ёсць жалезная агароджа, жоўтага колеру.

У брацкай магіле пахавана 83 воіна, якія загінулі ў 1943–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных – воіны, што загінулі ў ліпені 1944 г. пры разгроме акружаных войск праціўніка ў мінскім “катле”.

Пачатая 23 чэрвеня 1944 г. Беларуская аперацыя, вядомая пад кодавай назвай «Баграціён», вызначалася шырокамаштабным і імклівым наступленнем савецкіх войскаў. На першым яе этапе (23.06.1944 – 04.07.1944) была праведзена Мінская аперацыя (29 чэрвеня – 4 ліпеня), у выніку якой і быў вызвалены Смалявіцкі раён.

У выніку Мінскай аперацыі ў лясах апынулася 105-тысячная групіроўка ворага. Паступова кальцо сціскалася і канчаткова разгром групіроўкі праходзіў у асноўным на тэрыторыі Смалявіцкага раёна, дакладней, яго паўднёвай часткі. Цэнтрам мінскага «катла» стала в. Пекалін. Найбольш жорсткія баі праходзілі ў раёне в. Волма. Тут былі сканцэнтраваны галоўныя сілы гітлераўцаў, якія ішлі ляснымі дарогамі ў напрамку Студзенка – Пекалін – Волма, Пяцігодка – Волма.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступа: 20.12.2022.

2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2 / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мн. : БелСЭ, 1987. – 308 с.

3. Официальный сайт Смолевичского районного исполнительного комитета [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://smolevichi.gov.by/ru/region/putevoditel-po-voinskim-zakhoroneniyam.html. – Дата доступа: 15.10.2022.

4. Памяць. Беларусь : рэспубліканская кніга / С. П. Самуэль [і інш.]; пад агул. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995. – 623 с.

5. Памяць : Смалявіцкі раён. Жодзіна : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [уклад.: Ю. Я. Гіндзін, Г. У. Разумаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.

6. Карта Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://nakarte.by/drachkovskiy-selsovet. – Дата доступа: 15.10.2022.